АБ УСІМ, ШТО БАЛІЦЬ

№ 13/20/—26.Ш—1976
МЕНСК

ТОЛЬКІ ГУТАРКА ХОДЗІЦЬ ТАКАЯ...
Я.КУПАЛА

## ГУТАРКА

### НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ ВЫШЭЙ ЗА УСЁ

У чым прычына канфлікту паміж Савецкім Саюзам і Кітаем? Афіцыйна тлумачыцца ідэалагічнымі разыходжаннямі паміж кіруючымі партыямі. Аднак такое сцверджанне не можа быць пераканаўчым. Гісторыя поўна прыкладаў, якія паказваюць, што ідэалагічнае адзінства не перашкаджала палітычнай і ваеннай варожасці, як і ідэалагічная варожасць не перашкаджала палітычным і ваенным саюзам. У апошнюю сусветную вайну знаходзіліся ў адзіным лагеры Савецкі Саюз і капіталістычныя краіны. Ідэалогія — аддёка не галоўны фактар ва ўзаемаадносінах правячых партый і тым больш дзяржаў.

У дадзеным выпадку ідэалагічныя разыходжанні з'яўляюцца толькі покрывам больш глыбокіх разыходжанняў, а менавіта, нацыянальных, дзяржаўных. Ніводная з гэтых дзяржаў не жадае падначальваць свае інтарэсы інтарэсам другой. Канфлікт паміж дзвюмя буйнейшымі сацыялістычнымі краінамі паказаў, што гісторыя прадаўжае рухацца наперад не толькі барацьбой класаў, але і (магчыма, нават у большай ступені) барацьбой нацый. Тое, што кіраўнікі гэтых партый і дзяржаў абвінавачваюць адзін другога ў вялікадзяржаўным шавінізме, добра паказвае, што як адны, так і другія ў аднолькавай меры не кіраваліся і не кіруюцца прынцыпамі пралетарскага інтэрнацыяналізму, што апошні ў іх вуснах — гэта толькі слоўнае прыкрыццё іх імперыялістычных намераў і абман залежачых ад іх малых народаў.

Цяпер ужо стала відавочным, што сацыялізм, як і другія сацыяльныя фармацыі, не нясе з сабой ні міру, ні братэрства паміж народамі. Наадварот, шавінізм ва ўмовах сацыялізму набывае нябачныя раней памеры, што мы бачым на прыкладзе Савецкага Саюза і Кітая. Дарэмна, нам здаецца Г.Кісінджэр баіцца, што калі камуніс-

ты у Італіі і Францыі прыйдуць да ўлады, то гэта заставіць Амерыку перагледзець свае адносіны да названых краін. Дарэмныя страхі. Ні італьянскія, ні французскія камуністы не прададуцца Маскве і не падумаюць выходзіць з НАТА. Найперш яны пастараюцца апеляваць да нацыянальных пачуццяў сваіх народаў, і на гэтым і будуць умацоўваць сваю ўладу. Нездарма ж ужо зараз французскія камуністы імкнуцца перахапіць у галістаў ідэю моцнай і незалежнай Францыі. Усе гэтыя факты сведчаць, што ідэя абароны нацыянальных інтарэсаў з'яўляецца важнейшай прыкметай нашага часу. Яшчэ ў большай ступені гэтай ідэі павінны быць адданымі мы, беларусы.